# СУПРАЦОЎНІЧАЮЦЬ БІБЛІЯТЭКІ

Беларусь і Літва маюць агульныя гістарычныя карані. Узаемасувязі паміж краінамі не знікаюць і на сучасным этапе. У 1995 г. паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкай Літвы імя М. Мажвідаса быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве, адным з пунктаў якога з'яўляецца абмен выстаўкамі.

Першым крокам у кірунку сумеснай працы з'явілася адкрыццё ў 1997 г. у Вільнюсе выстаўкі кніг "З крыніц Беларусі" з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ), прысвечанай яе 75-годдзю. На выстаўцы экспанаваліся беларускія выданні за папярэднія 10 гадоў: энцыклапедыі, даведнікі, факсімільныя ўзнаўленні выдатных дакументальных помнікаў Беларусі, альбомы па старажытнаму і сучаснаму мастацтву.

У тым жа годзе літоўскія калегі наведалі Мінск з выстаўкай, прысвечанай 450-годдзю першай друкаванай літоўскай кнігі – "Катэхізісу" Марцінаса Мажвідаса.

Адметнай падзеяй 1999 г. стала выстаўка "Кніжныя мерыдыяны", якая была падрыхтавана супрацоўнікамі НББ і ўрачыста адкрыта ў Літве.

У мінулым годзе ў НББ святочна прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 10-годдзю аднаўлення Літвы, у межах якіх былі наладжаны выстаўкі "Падарожжа па Літве", "Грошы Літоўскай Рэспублікі", "Мастацкія фотаздымкі г. Вільнюса".

У чэрвені бягучага года наведвальнікі НББ мелі магчымасць пазнаёміцца з выстаўкай "Лепшыя кнігі Літвы", урачыстае адкрыццё якой адбылося 29 мая. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літвы ў Рэспубліцы Беларусь Іонас Паслаўскас у прывітальным слове адзначыў адкрыццё выстаўкі як культурную падзею. У экспазіцыі былі прадстаўлены кнігі, якія выдадзены за апошнія пяць гадоў выдавецтвамі Літвы і ўзнагароджаны на конкурсах кніжнага мастацтва Літвы, — каля 80 кніг, альбомаў, выданняў для дзяцей. У іх ліку старажытныя карты Літвы з калекцыі бібліятэкі Вільнюскага універсітэта, выдадзеныя выдавецтвам "Вага".

Экспанаваныя кнігі былі вылучаны на конкурсах па наступных крытэрыях:

— графічнае афармленне;

— друкарскае афармленне: структура макета, якасць выяўленчага і тэкставага матэрыялу, якасць набору, паперы і пераплётнага матэрыялу, якасць друку і пераплёту.

На выстаўцы былі прадстаўлены выданні па наступных відах:

— грамадская літаратура;

— навуковая літаратура, манаграфіі;

— інфармацыйныя выданні;
— выданні па мастацтву, каталогі;
— мастацкая літаратура і эсэістыка;
— кнігі для дзяцей і юнацтва.

**Алена Даўгаполава,**
*загадчык адзела рэкламы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*